(Бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 25 1933 г. ПЯТНІЦА № 187 (4731)

Год выданьня XVII

Пралетары усіх краеў, злучайцеся!

Прывітаньне тав. ГІКАЛО

Праўленьне Беларускага саюзу каапэрацыі інвалідаў рапартуе, што абяцаньне дадзенае 3-му пленуму Асоавіяхіму БССР і тав. **Эйдману**—старшыні Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму СССР: пабудаваць баявы самалёт у 1933 г. сіламі чырвоных партызан інвалідаў вайны і працы, працуючымі ў арцелях каапэрацыі інвалідаў БССР з гонарам выканана. Да дня авіяцыі СССР—18-га жніўня намі перавядзена 40 тыс. руб. Цэнтральнаму Савету Асоавіяхіму БССР для пабудовы баявога самалёта імя каапэрацыі чырвоных інвалідаў БССР. Апрача гэтага па нашай сыстэме сабрана 12 т. руб., што складае аднадзенны заробак у фонд эскадрыльі імя Кагановіча.

Няхай жыве і мацнее авіяцыя СССР!

Няхай жыве Чырвоная армія—пільны вартаўнік савецкіх межаў і яе правадыр—тав. Варашылаў!

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным!

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт КП(б)Б на чале з тав. Гікалю.

Праўленьне Белкаапсаюзу.

НЕЛЬГА ДАЛЕЙ ЦЯРПЕЦЬ ГАНЕБНАЙ РАБОТЫ ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ

Апошнія пастановы партыі і ўраду аб вугальным Данбасе і аб чыгуначным транспарце маюць выключна важнае прынцыповае і практычнае значэньне. Урокі, якія выцякаюць з гэтых пастаноў, павінны быць улічаны ўсімі галінамі народнай гаспадаркі. ЦО нашай партыі «Правда» яшчэ 5 ліпеня з поваду гэтага пісала: «Трэба зусім ясна зразумець, што гвоздь пытаньня — у ліквідацыі канцылярска-бюракратычных мэтадаў кіраўніцтва. Гэта пытаньне стаіць перад вугольнай прамысловасьцю Данбаса і іншых басэйнаў, перад мэталургіяй і ІНШЫМІ ГАЛІНАМІ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ» (падкрэсьлена намі. Рэд.).

Урокі, якія выцякаюць з пастаноў ЦК і СНК павінны былі быць улічаны водным транспартам, які ў асноўным «хварэе тымі-ж хваробамі, што і чыгуначны», які сваім адставаньнем усклядняе і затрудняе работу чыгуначнага транспарту.

У Гомелі ёсьць беларускае кіраўніцтва Днепра-Дзьвінскага рачнога транспарту (ДДУРТ), якое аб'ядноае ўсю водную сетку БССР. Запытайцеся ў кіраўнікоў басэйну — начальніка ПАЧЭБУТА, пэртарганізатара ШПАКА, старшыні райкамводу ПІВУНОВА, як яны перабудоўваюць работу, яны проста адкажуць: «Паколькі Наркамвод не «преподал» нізай структуры, паколькі няма яснай дырэктывы зьверху, пастольки мы не маглі і перабудоўвацца». У гатым тлумачэньні, як у кроплі вады, адлюстроўваюцца бюракратычныя мэтады работы — чакаць указкі зьверху, чакаць цыркуляра. Без іх—ні кроку. У выніку ня толькі ня было перабудовы, але нават пастановы партыі і ўраду і артыкулы «Правды» да гэтага часу не прапрацаваны сярод воднікаў.

Ці мела-ж магчымасьць кіраўніцтва басэйну, не чакаючы цыркуляраў Наркамводу, перабудоўвацца? Бязумоўна мела. Хіба без цыркуляраў зьверху ня ясна злачынасьць асяданьня спэцыялістаў у апараце кіраўніцтва пры недахваце іх на лініі? А гэта-ж факт, што трыкутнік басэйну фактычна яшчэ не прыступіў да перакідкі інжынэрна-тэхнічных работнікаў з канцылярыі на вытворчасьць. У той час, калі ўсіх ІТР па басэйну нічыцца 83 чалавекі, калі ў такіх буйнейшых майстэрнях, як віцебская і магілёўская, няма ні аднаго інжынэрна-тэхнічнага работніка, а інжынэраў на лініі па ўсім басэйне толькі 1-2, у апараце кіраўніцтва сядзяць дзесяткі інжынэраў, прычым рад з іх (**ЕПАНЧЫК, ПАРНАШКА** і інш.) прыстасоўваюць свае веды... да складаньня зводак. Так расстаўлены спэцыялісты ў ДДУРТ.

Хіба без цыркуляраў ня ясна неабходнасьць барацьбы «з вадабязьню», якой хварэюць дзесяткі капітанаў і мэханікаў? А гэта-ж факт, што 24 капітаны і мэханікі па басэйну працуюць на беразе на другарадных пасадах (у Віцебску, напрыклад, мэханік Марковіч працуе... загадчыкам сталовай) у той час, як на суднах не хапае кваліфікаванай сілы.

Хіба без цыркуляра зьверху ня ясна-што працаваць бяз тэхнічна-ўгрунтаваных норм немагчыма. А да гэтага-ж часу справа тэхнармаваньня канцэнтравалася не ў майстэрнях, а ў кіраўніцтве басэйну, у руках тэхніка **МАЦЬКУНОВА**, у выніку плённай «работы» якога на працягу трох год басэйн ня меў тэхнічна ўгрунтаваных норм.

Нарэшце, хіба без цыркуляра нельга было прыступіць да ліквідацыі абураючай урэгулёўкі ў аплаце працы, да ўзмацненьня працдысцыпліны, да ліквідацыі канцылярска-бюракратычных мэтадаў кіраўніцтва і г. д.?

А ўраўнілаўка самая злачынная па нуе ве ўсіх зьвеньнях водкага транспарту. Прыведзем толькі некалькі фактаў. Капітан катэру атрымлівае больш чым капітан буйнага параходу. Капітан параходу ў скрэднім атрымлівае 160 РУБЛЁЎ у месяц (параход «Чэкіст») у той час, як справавод апарату кіраўніцтва басэйну атрымлівае 175 РУБЛЁЎ. Стаўкі інжынэрна-тэхнічных работнікаў ніжэй нікольні ня вышэй ставак ІТР з апарату кіраўніцтва басэйну, за тое, наадварот, забясьпечэньне прадуктамі апошніх значна лепшае, хоць унутры апарату басэйну існуе таксама ўраўнілаўка, бо і ІТР, і статыстыкі забясьпечваюцца аднолькава.

Дзе-ж тут бальшэвіцкія прынцыпы аплаты?

Або ўзяць працдысцыпліну. Гэта—забыты вучастак. Лепш за ўсё характарызуе стан дысцыпліны лік аварый, які быў спачатку бягучай навігацыі. Аб аварый, з якіх па аднэй гомельскай прыстані было 14, прынесьлі тэхнічных і камэрцыйных страт каля 200 тыс. рублёў. 70 проц. аварый зьяўляюцца простым вынікам нізкай працдысцыпліны. Ці былі гэтыя факты, кожны паасобку, сваячасова ўзьняты на адпаведную прынцыповую вышыню? Нічога падобнага. Відаць і на гэта кіраўнікі ДДУРТ чакалі цыркуляра зьверху.

П'янства — гэта старая ганебная хвароба плаўскладу—ня зжыта і значна пашырана і дагэтуль. На параходах сыстэматычныя палойкі.

Ці ёсьць у мэтадах кіраўніцтва якія-небудзь зьмены з часу апублікаваньня пастаноў ЦК і СНК аб Данбасе і чыгуначным транспарце? На жаль, ніякіх. Усё тыя-ж канцылярска-бюракратычныя саноўна панскія мэтады.

Возьмем адзін з асноўных паказальнікаў перабудовы—праверку выкананьня. Ці ёсьць яна ў апараце кіраўніцтва басэйну? На жаль, гэтым ня можа пахваліцца ні адзін работнік апарату кіраўніцтва. Тут гэту справу, як і сотні іншых, абюракраціі, загадзя асудзілі ды на правал.

Трыкутнік басэйну заключае аб'ектыўна прыстаняй і параходаў не на грунце жывых фактаў праверкі, а паводле папяровых данясеньняў, справаздач і інш. Сустрэчным папяровым патокам адказвае і апарат кіраўніцтва басэйну. Даволі сказаць, што толькі за палову жніўня з канцылярыі кіраўніцтва басэйну адпраўлена на пэрыферыю больш 500 пакетаў, прычым у кожным з іх ад 2 да 5 асобных цыркуляраў, загадаў і інш. Такавы мэтады «кіраўніцтва». Аб перабудове-ж ніхто і ня думае. Гэта-ж невыпадкова, што на нарадзе трыкутнікаў раёнаў і прыстаняй пры кіраўніцтве басэйну 7 жніўня і начальнік ПАЧЭБУТ, і партарганізатар **ШПАК** у сваіх выступленьнях моўчкі абыйшлі пытаньне аб перабудове. Аб гэтым «забыліся».

Аднак, паглядзімо другое—як басэйн сустрэў і праводзіць асеньня-зімовыя перавозкі, як выконваецца навігацыйны плян работы. Гэта-ж асноўны паказальнік, які акрэсьлівае перабудову. Трыкутнік раёну запэўніе, што і з гэтым справа стаіць добра: на 15 жніўня навігацыйны плян грузаперавозак выканан на 63,3 проц. і пасажыра-перавозак на 54 проц. Ці так гэта? У афіцыяльных зводках сапраўды фігуруе гэта лічба. Калі-ж вы захочаце праверыць з якога разьліку выходзілі пры вызначэньні гэтага процанту выкананьня, вам гэта ня ўдасца.

Вас «пераканаюць» у адным, што плян правільны, бо атрыман з Заходняга РУПР'у на аснове данай туды заяўкі аб наяўнасьці цягавай сілы.

Аднак, чаму ў заяўцы Заходняму РУПР'у ня фігуруе цягавая сіла маторных суднаў? На гэта кіраўнікі нічога яскравэ вам не адкажуць. Можа маторных суднаў няма ў басэйне? Нічога падобнага, іх 27, з агульнай магутнасьцю ў 814 індыкатарных сіл. Аказваецца, гэты флёт **ПРОСТА ЎТАІЛІ, КАБ АТРЫМАЦЬ ЗЬМЕНШАНЫ ПЛЯН.** Гэта злачынае «очковтирательство» да апошняга часу партыйнай арганізацыяй ня было ўскрыта. **ВЫКЛІКАЕ СУМНЕНЬЕ ДАКЛАДНАСЬЦЬ ВЕСТАК АБ ПАРАВЫМ І НЕПАРАВЫМ ФЛЁЦЕ.** Перараджэнцы, страціўшыя партыйны твар, ашуканцы партыі і дзяржавы яшчэ ня выведзены на чыстую ваду. Яны зараз стараюцца прыкрыць свае злачынствы тлумачэньнямі, што, моў, маторны флёт яшчэ не асвоен, што ён часта выходзіць са строю. Гэта «тлумачэньне» прад'яўе ім-жа абвінавачаньне. Хіба можна апраўдаць такое становішча, што за два гады знаходжаньня гэтага флёту ў басэйне, ён яшчэ не асвоен? Апроч таго, трэба напомніць кіраўніцтву басэйну, што на крычаўскім вучастку, у Барысаве і інш. маторны флёт працуе ня дрэнна. Чаму-ж яго ўтаілі?

Асеньня-зімовыя перавозкі пачаліся. Нават паводле пераменшанага пляну, басэйн павінен за гэты час перавесьці 60.000 тон гародніны і 30.000 тон збожжа. Як-жа праведзена падрыхтоўка? Толькі 28 ліпеня (калі да пачатку перавозак заставаліся лічаныя дні) вышаў з-пад пяра начальніка басэйну ПАЧЭБУТА загад аб... падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак. Нарада трыкутнікаў раёнаў і нізавых вытворчых зьвеньняў па гэтым-жа пытаньні была склікана... у разгары перавозак — 7 жніўня.

Перавозкі пайшлі ўзмоцненымі тэмпамі. Кіраўніцтва басэйну крычыць, што нехапае цягі, нехапае непаравога флёту, а ў гэты час вялікія прастоі суднаў, на беразе па 2-3 месяцы стаяць дзесяткі неадрамантаваных суднаў. Толькі ў Гомелі стаяць больш трох месяцаў 4 непаравыя судны грузападёмнасьцю ў 500 тон кожнае. Рамонт пачаўся толькі ў апошнія дні, але праходзіць чарапашымі тэмпамі. Графіку рамонту няма. Частыя затрыманьні з-за дробязяй. 19 жніўня, напрыклад, было затрыманьне з прычыны недахвату фанэры. А яна ляжала тут-жа побач—на складзе, але ніяк нельга было АФОРМІЦЬ атрыманьне. Такі ўжо «стыль» работы бюракратаў з ДДУРТ.

На гэтай-жа прыстані за ліпень было больш 13.000 гадзін прастою суднаў. Зараз на гэтай прыстані па іх віне і па віне Загатзбожжа непаравы флёт са збожжам прастойвае па 3—4 дні, чакаючы разгрузкі, але рашучых мер да ліквідацыі такога становішча ні хто ня прымае. Аб нясур'ёзнасьці у падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак гаворыць хоць-бы і такі факт, што гомельская прыстань толькі зараз усхамянулася, што ёй нехапае 150 грузчыкаў.

У выніку дрэннай падрыхтоўкі ўжо з першых дзён перавозак збожжа, на радзе прыстаняй стварыліся пробкі (**ВЕТКА, ЧАЧЭРСК, МАЗЫР, КАРМА** і інш.). Ня прыведзены ў парадак складзкія памяшканьні (Мазыр і інш.). Падбор плаўскладу адбываўся самацёкам. Недарма сюды пралезьці клясава-варожыя і злачынныя элемэнты, недарма пакражы прынялі масавы характар. Судно № 80 прывезла з Чачэрску 52,7 тоны збожжа, а ў накладной значыцца 57 тон; з Веткі адпраўлена ў адным судне 20 тон збожжа, а прынята 18,9, у другім адпраўлена — 29,2, а прынята — 27,8 і інш.

Некалькі споў аб партыйнай ячэйцы апарату ДДУРТ і ў прыватнасьці яе сакратары **МАШКОВЕ.** Яго работа зусім адпавядае мэтадам работы трыкутніка басэйну. Аднойчы паставіў ён пытаньне на бюро аб перабудове работы апарату. Даручылі трыкутніку «распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы» і супакоіліся. Нават на партсход не перанесьлі пытаньня. Трыкутнік доўга ня выконваў пастановы, але гэта нікольні ня трывожыла Машкова і бюро ячэйкі. 17 жніўня трыкутнік басэйну ўрэшце палічыў «сваячасовым» выканаць пастанову бюро. Замкнуліся ў габінэце і пачалі складаць плян перабудовы. Як трэба было і чакаць, чыноўнікі намецілі пампадурскія правілы «для ўсіх і ўся», а не плян, які павінен папепшыць работу воднага транспарту.

Партыйная ячэйка ня бачыць або ня хоча бачыць засьмечанасьці апарату ДДУРТ, дзе да гэтага часу ёсьць рад белых афіцэраў (**ДРЭЙШАЎ, БЕЛАБАРОДАЎ, ФУРМАН** і інш.) і шмат іншых клясава-варожых элемэнтаў. У кіраўніцтве басэйну выдаецца насьценгазэта, якая за апошні час ні дрэнна разгарнула самакрытыку. Аднак, ніхто на яе выступленьні не рэагуе.

Партарганізатар басэйну **ШПАК** аб усім гэтым ведае, але мер ня прымае. Мэтады яго габінэтнага кіраўніцтва давялі да вялікай засьмечанасьці партыйнай арганізацыі. У яго пад носам, на працягу доўгага часу быў сакратаром буйнейшай партыйнай ячэйкі гомельскіх рамонтных майстэрань **СУХАРУКАЎ** — былы эсэр, які ўтаіў гэта ад партыі, заціскаў самакрытыку і інш. Толькі зараз, у часе чысткі, ён выкрыт рабочымі. Упаўнаважаны воднай арганізацыі **ЗАЙЦАЎ** (член партыі), удзельнік банды Галака, якая доўга апэравала ў Лоеўскім раёне. Парторг парахода «Ульянаў» **ПАШЧАНКА**—п'яніца, заціскаў самакрытыку. Прыкладаў засьмечанасьці можна было-б прывесьці больш.

Аб расстаноўцы партсіл можна меркаваць па такіх фактах: пры наяўнасьці партарганізацыі ў 400 чалавек, амаль палова знаходзіцца ў РУПР'ах і на прыстанях. На чатырох параходах зусім ня ма ні аднаго камуніста.

Стан работы ДДУРТ больш чым дрэнны. Толькі бальшэвіцкая перабудова, на аснове вопыту чыгуначнага транспарту, можа вывесьці водны басэйн БССР на шырокую дарогу, забясьпечыць посьпех асеньня-зімовых перавозак. **ЯК ВІДАЦЬ, НАЯЎНЫ СКЛАД КІРАЎНІЦТВА БАСЭЙНУ ТАКУЮ ПЕРАБУДОВУ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ.**

Уборкай ураджаю бяз страт, кругласутачнай малацьбой і вывазкай збожжа на загатпункты

ЗАВАЮЕМ ПЯРШЫНСТВА Ў СПАБОРНІЦТВЕ З ЗАХ. ВОБЛАСЬЦЮ

ХОД УБОРКІ АЗІМЫХ І ЯРАВЫХ ПА РАЁНАХ БССР

На 20 жніўня (у процантах да пляну)

№ п/п	Назва раёнаў	Зжата азімых	Зьвезена азімых	Абмалочана	Зжата яравых	Зьвезена
	ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА					
1.	Дуброўенскі	100,0	55,9	16,7	8,7	2,1
2.	Чашніцкі	100,0	64,8	10,0	12,8	—
3.	Бешанковіцкі	100,0	70,1	16,5	16,3	73,6
4.	Лёзьнянскі	100,0	42,5	13,3	16,4	34,2
5.	Вушацкі	100,0	28,5	25,1	9,2	—
6.	Дрысенскі	94,7	81,5	29,3	13,4	3,2
7.	Полацкі	94,3	92,0	26,1	13,0	11,2
8.	Расонскі	93,5	90,2	23,0	4,7	20,5
9	Сураскі	92,6	74,8	12,3	14,8	—
10.	Асьвейскі	90,0	90,6	46,2	7,3	39,1
11.	Гарадоцкі	87,7	39,1	8,9	1,8	—
12.	Лепельскі	85,6	73,7	17,6	14,0	48,3
13.	Аршанскі	84,7	80,4	27,8	16,5	25,8
14.	Сеньненскі	83,6	85,9	4,0	13,6	—
15.	Сяроцінскі	81,8	77,6	20,9	13,9	52,1
16.	Віцебскі	80,3	40,4	9,6	10,7	23,8
1.	Бялынічскі	100,0	91,1	26,2	33,5	—
2.	Крычаўскі	100,0	92,9	39,6	41,4	68,6
3.	Жыткавіцкі	100,0	100,0	14,9	34,2	66,1
4.	Глускі	100,0	75,3	3,5	57,3	42,8
5.	Парыцкі	100,0	100,0	21,8	31,5	65,2
6.	Пятрыкоўскі	100,0	99,9	—	57,5	86,6
7.	Брагінскі	100,0	99,9	23,7	48,5	24,8
8	Рэчыцкі	100,0	96,5	14,4	56,4	94,1
9.	Церахаўскі	100,0	99,1	32,9	39,4	77,5
10.	Асіпавіцкі	99,0	100,0	40,6	58,7	64,6
11.	Быхаўскі	99,8	99,8	25,3	26,8	75,7
12.	Крупскі	99,6	87,3	15,7	17,6	44,7
13.	Чырвонапольскі	99,6	86,7	18,0	31,9	55,0
14.	Чырвонаслабодзкі	99,5	98,6	13,5	59,5	56,3
15.	Вузьляванскі	99,3	99,1	18,9	23,0	48,4
16.	Плешчаніцкі	99,2	54,7	19,0	16,5	36,4
17.	Чэрвеньскі	99,1	93,6	3,9	69,5	49,3
18.	Менскі	99,1	87,1	11,2	34,4	24,4
19.	Бярозінскі	98,8	94,8	15,7	17,6	44,7
20.	Кармянскі	98,8	99,9	11,9	39,4	80,6
21.	Камарынскі	98,7	97,7	20,1	31,8	21,5
22	Пухавіцкі	98,1	77,4	16,3	39,7	37,0
23.	Талачынскі	98,0	63,6	21,3	6,1	48,4
24.	Буда-Кашалёўскі	97,8	98,1	30,1	42,0	71,0
25.	Смалявіцкі	97,6	86,0	13,1	34,8	50,8
26.	Клічаўскі	97,6	86,7	20,6	18,7	—
27.	Старадарожскі	97,6	84,9	15,2	36,3	54,5
28.	Копыльскі	97,2	97,6	7,5	48,7	89,7
29.	Тураўскі	97,3	100,0	19,3	24,3	96,3
30.	Веткаўскі	97,1	96,3	34,3	22,9	74,5
31.	Магілёўскі	95,1	76,2	26,3	22,6	45,2
32.	Нараўлянскі	94,3	100,0	16,3	27,9	90,7
33.	Старобінскі	94,3	99,9	23,9	51,2	15,6
34.	Чэрыкаўскі	93,4	98,2	27,6	50,4	12,2
35.	Касьцюковіцкі	93,3	100,0	33,3	47,1	81,5
36.	Латыпскі	93,3	47,1	12,4	12,6	36,5
37.	Шклоўскі	93,0	73,6	27,5	16,2	38,4
38.	Прапойскі	92,9	100,0	10,6	52,4	80,0
39.	Бягомльскі	92,1	71,7	12,6	24,2	55,0
40.	Слуцкі	92,2	95,1	18,5	63,6	46,0
41.	Чачэрскі	91,8	100,0	25,4	45,8	79,3
42.	Дзяржынскі	91,4	80,4	15,2	19,6	30,3
43.	Заслаўскі	91,0	68,2	14,5	18,3	20,8
44.	Рагачоўскі	90,1	91,8	18,4	35,2	1,9
45.	Мсьціслаўскі	88,8	53,2	13,0	12,5	55,4
46.	Хойніцкі	88,6	100,0	19,8	49,1	55,1
47.	Бабруйскі	88,2	74,1	17,2	37,3	28,6
48.	Горацкі	86,6	67,3	22,8	16,1	48,8
49.	Уваравіцкі	86,5	38,0	22,2	46,7	65,4
50.	Чаўскі	85,3	86,3	28,5	20,2	72,7
51.	Клімавіцкі	82,6	96,0	29,2	33,6	9,7
52.	Барысаўскі	—	99,4	18,6	28,2	82,2
53.	Мазырскі	—	100,0	14,3	29,9	39,6
54.	Любанскі	—	99,7	29,1	51,4	55,4
55.	Лельчыцкі	—	97,7	25,7	36,7	52,9
56.	Ельскі	—	98,0	14,5	23,5	11,4
57.	Гомельскі	—	100,0	20,9	28,7	72,7
58.	Жлобінскі	—	99,8	21,8	38,2	30,9
59.	Лоеўскі	—	91,1	21,5	35,0	60,2
	Усяго па БССР	95,0	81,6	19,7	29,4	49,3

Зводка складзена па 72 раёнах на 20 жніўня. Раёны: Віцебскі, Гарадоцкі і Камарынскі вестак на 20 ня прыслалі.

Калгасы Жлобіншчыны выканалі 50 проц. гадавога пляну збожжаздачы

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Шырока разгорнутае ў раёне сацыялістычнае спаборніцтва забясьпечыла выкананьне жнівеньскага пляну збожжапаставак дзяржаве. На 20 жніўня гадавы плян збожжапаставак выканан на 38,27 проц. Калгасы выканалі гадавы плян збожжаздачы на 50,8 проц. Упераадзе ідуць калгасы, абслугоўваемыя МТС, якія здалі дзяржаве 53,8 проц. належачага з іх збожжа.

Жлобін спаборнічае з Нова-Сакоўліцкім раёнам Заходняй вобласьці. 20 жніўня раён уключыўся ва ўсебеларускую пераклічку на лепшае правядзеньне ўборкі і збожжапаставак.

На пасяджэньні бюро РК КП(б)Б, прэзыдыуму РВК і палітаддзелу абноўлен раённы штаб па спаборніцтву. Жлобінская раённая газэта і шматтыражка палітаддзелу МТС у часе пераклічкі арганізуюць абменныя полосы з газэтай Нова-Сакалішчанскага раёну, на якіх падагуляць папярэднія вынікі спаборніцтва і падзеляцца вопытам работы. **НІКІЦІН.**

Чаму прарасла пшаніца

РАГАЧОЎ. (Наш. кар.).

Якасьць — важнейшае зьвяно ў барацьбе за выкананьне пляну ўборкі і збожжапаставак. У радзе калгасаў Рагачоўшчыны гэта важнейшае зьвяно выпала з-пад увагі праўленьняў.

У калгасе **«Камінтэрн»** больш тыдня зжатая азімая пшаніца на плошчы 2,7 га ляжыць на полі. Снапы не складзены ў бабкі і пачарнелі ад дажджоў, пшаніца прарасла.

У калгасе «Дуброва» малацілі сырое збожжа. У выніку 30 проц. зерня засталося ў саломе. У калгасах «Чырвоны араты», «Ніва Кастрычніка», імя Будзённага зжатае жыта больш тыдня ляжыць на полі і ня звозіцца ў гумно.

Рагачоўскі раён спаборнічае з Жыздрынскім раёнам Заходняй вобласьці, але раённыя арганізацыі не скарысталі спаборніцтва для мабілізацыі актыўпасьці калгасьнікаў на барацьбу за якасьць і тэмпы ўборкі і збожжаздачы. Ні спаборніцтва ў раёне нікто ня ведае. Нават раённая газэта не зьвясьціла аб гэтым ні аднаго радку.

Камісія, якая павінна кіраваць спаборніцтвам (старшыня — загадчык агітмасу РК КП(б)Б Ваўчкоў), ні разу ня зьбіралася.

Лёзунгаў, плякатаў, чырвонай дошкі, якія-б паказвалі, як спаборнічаюць калгас з калгасам, брыгада з брыгадай, хто адстае, хто ідзе ўперадзе—усяго гэтага і днём з агнём нідзе ня знойдзеш. На ўсе запытаньні Ваўчкоў дае адзін адказ—няма часу, ету ў раён».

У Рагачоўшчыне сацыялістычнае спаборніцтва падмянілі аліюйшчынай. **Р. В.**

НАКОНТ ДОУГАВУХІХ...

Кіраўніцтва Вушацкай раённай МТС злачынна ігнаруе ільнацерабілкі «Камсамолка», у той час, як гэтыя маёўны палкам апраўдалі сябе ў рабоце. Пануе кулацкая легенда аб перапрацэньнасьці машын. Пануюць антымэханізатарскія настроі.

Малюнак Вал. Мядзьведзева.



Гудзіць машына. Рэзвы мах!
Цярэбіць лён вясёла, лоўка,
Бо, зразумела, не дарма
Яна завецца «Камсамолка»...

Там, дзе шляхамі перамог
Прайшоў з вясны калгасны трактар,
Яе прызналі на палёх
Даўно «дэ-юрэ» і «дэ-факто»!
Але яшчэ часамі ў нас
Ня хочуць людзі даць ёй слова, —
Як, не раўнуючы, адна
З вушмі даўжэзнымі жывёла!

Эпіграма Юр. Лявонняга.

Малатарні ў ненадзейных руках

Сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч у спэцыяльнай тэлеграме патра баваў ад Заслаўскага раённага кіраўніцтва перакліканьня ўсёй партарганізацыі, калгасьнікаў і аднаасобнікаў на пасьляховае сканчэньне ў бліжэйшыя два-тры дні ўборкі азімых і ячменю, разгортваньне абмалоту і здачы збожжа дзяржаве.

Аднак, ня гледзячы на ўсім выразную дырэктыву тав. Шаранговіча, раённае кіраўніцтва не забясьпечыла належнага пералому ў ходзе ўборкі і збожжапаставак. Уборка азімых яшчэ ня скончана. Па 20 жніўня па Заслаўшчыне ўбрана 91 проц. азімых, зьвезена з поля 88,2 проц. **Абмалот зусім не разгорнуты. Абмалочана толькі 14,5 проц.** Яравых зжата ўсяго 18,3 проц.

У чым прычыны адставаньня раёну? У Заслаўшчыне ня здолелі правільна расставіць рабочую сілу ў калгасах, максымальна скарыстаць убіраючыя машыны і спалучыць уборку з абмалотам і здачай збожжа дзяржаве.

У большасьці сельсаветаў і калгасаў складаныя і поўскладаныя ўбіраючыя машыны не скарыстоўваюцца. Напрыклад, кіраўнікі Апусінскага сельсавету заяўляюць: лепш жаць сярпамі. Большасьць жнівярак не скарыстоўваецца. У калгасе **«Полымя»** на жнівярку пасадзілі былога папа. Брыгады, якія працуюць на жнівярках, сыстэматычна недавыконваюць норм (калгасы «Зьвязда», «Ударнік», «Полымя», «Чырвоны пагранічнік»).

Дрэнная арганізацыя працы на ўборцы ў радзе калгасаў прыводзіць да вялікіх страт. У калгасе **«Зьвязда»** зжата 296 га жыта і 18 га ячменю, а ўбрана з поля толькі 60 га. Рэшта жыта можа пад дажджом. У калгасе **«Чырвоны пагранічнік»** са 165 га зжатага жыта ўбрана ўсяго 22 га. У калгасе **«Камінтэрн»** яшчэ ня ўбрана каля 200 гэктар збожжа.

Правільная арганізацыя абмалоту вырашае посьпех збожжапаставак. У Заслаўшчыне да малацьбы зусім не падрыхтаваліся. У большасьці калгасаў перад абмалотам малатарні не правяраліся. Людзі, якія працуюць на малатарнях, не падрыхтаваны. У калгасе **«Зьвязда»** дзьве малатарні за дзень намалацілі ўсяго 51 цэнт. збожжа. Брыгада Фурса з 30 чалавек за поўдня намалаціла ўсяго 20 цэнт. Малацьбу пачынаюць а 9 гадз. раніцы, а канчаюць у 5-6 гадз. увечары. Сам брыгадзір Фурс больш бывае дома, чым ля малатарні. Ня лепш працуе малатарня і ў калгасе «Чырвоны пагранічнік», якая за дзень намалаціла 42 цэнт. і зараз зусім спыніла работу.

У брыгадзе Фурса вагаўшчыком ля малатарні стаіць маланісьмённы хлапчук. Штодня тут непаразуменьні з адпраўкай збожжа. Так, 14 жніўня з малатарні было накіравана 3,55 цэнт. збожжа. Пакуль давезьлі збожжа да сьвірна, не хапіла ўжо 2 кілё. Ні партыйная ячэйка, ні праўленьне калгасу на такія факты не зварачаюць ніякай увагі.

Уборка і збожжапастаўкі ў аднаасобным сэктары зусім выпалі з-пад увагі раённых арганізацый. 38 проц. жыта аднаасобных гаспадарак яшчэ ня зжата. Аднаасобнікі зусім ня прыступілі да абмалоту і не здалі ні аднаго кілё збожжа дзяржаве.

Такое «кіраўніцтва» ўборкай і збожжапастаўкай з боку раённых арганізацый спрыяе асяданьню збожжа ў калгасах, яно на руку куланкім элемэнтам, якія імкнуцца сарваць выкананьне пляну збожжапаставак.

Маркаў.

Саўгас „Кухцічы"—у калёне перадавых

УЗДА (па тэлеграфу). Сьвінасаўгас «Кухцічы» 23 жніўня выканаў гадавы плян здачы жыта дзяржаве, поўнасьцю зьвярнуў атрыманую ссуду. Азімыя абмалочаны на 91 проц. 60 проц. яравых пасеяў убраны. Саўгас пачаў асеньнюю сяўбу.

Дырэктар **Вілейка.**

Начальнік палітаддзелу **Архіпаў.**

НЕАДКЛАДНА РАЗГРУЗІЦЬ ВАГОНЫ СА ЗБОЖЖАМ

Сурова пакараць злачынцаў з менскай і рэспубліканскай кантор

Загатзбожжа, якія дапусьцілі псаваньне прадукцыі на складах

Струменьні збожжа новага ўраджаю, якія з кожным днём узмацняюцца, зіпнянаку захапілі Беларускую і Менскую канторы Загатзбожжа. Яны зусім не падрыхтаваліся да сустрэчы новага ўраджаю.

«Зьвязда» ўжо ўчора паведамляла, што на 22 жніўня ў Менску стаяў на рэйках па выгружаны 161 вагон са збожжам. Раніцай 24 жніўня колькасьць ня выгружаных вагонаў дасягнула 213. Збожжа працягвае паступаць, між тым, зараз Менская міжраённая кантора Загатзбожжа ня мае вольнай складзкай плошчы.

Работнікі Загатзбожжа паведамляюць, што ў Менск у бесплянавым парадку, без нарадаў паступае збожжа са Слуцку, Бабруйску, Бярозіны. Паступіла ўжо каля 50 вагонаў без нарадаў.

Чым выклікана «пробка» на ст. Менск?

Асноўная прычына заключаецца ў тым, што **Белзагатзбожжа і Менская міжраённая кантора рыхтаваліся да паставак збожжа тэмпамі і мэтадамі мінулага году, ня ўлічваючы новых абставін і зьмен, якія адбыліся ў краіне.**

Даволі адзначыць, што толькі 14 жніўня Белкантора Загатзбожжа занялася пытаньнем арганізацыі і стварэньня тэхнічнай базы. Між тым, збожжа новага ўраджаю пачало паступаць яшчэ ў першых чыслах жніўня. Яшчэ да гэтага часу апарат тэхнічнай базы, які закліканы кіраваць складзкай гаспадаркай, ня мае ні людзей ні памяшканьня для работы. На сёпешні дзень не хапае складаў на 14-15 тысяч тон.

Калі ў першых лічбах ліпеня перад кіраўніком Белзагатзбожжа тав. **Журэмскім** было рашуча пастаўлена пытаньне аб поўным забесьпячэньні збожжапаставак дадатковай складзкай плошчай ня менш як на 15 тыс. тон, тав. Журэмскі адказаў: «Не займайцеся панікай». Ён выходзіў з таго, што збожжа будзе паступаць та кімі-ж павольнымі тэмпамі, як у мінулым годзе і таму складаў хопіць.

Толькі 23 жніўня Менская раённая кантора атрымала заданьне ад Белзагатзбожжа падрыхтаваць склады для прыёмкі збожжа, якое паступіць на працягу апошніх дзён жніўня па ўсім жнівеньска-верасеньскім пляне. Няма нічога дзіўнага ў тым, што ўсе склады загружаны, а вагоны разгружаюць пад адкрытым небам.

Такавы вынікі злачынай работы Белзагатзбожжа і Менскай міжраённай канторы. Работнікі гэтых арганізацый замест жывой апэрацыйнай работы, замест таго, каб загадзя

ЧЫСТКА ПАРТЫІ

Камуністы правяраюцца на практычнай барацьбе за лінію партыі

У Бярозінскі раён камісія па чыстцы партыі прыехала 8 жніўня. Да гэтага дня план уборкі быў выканан толькі на 39 проц., план паставак збожжа дзяржаве — на 0,2 проц., перапрацоўка ільну — 0,2 проц. і сеназагатоўкі — 78 проц. У раёне не адчувалася бальшавіцкай барацьбы за выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Ужо з гэтага бачна, што райпартарганізацыя да чысткі сваіх радоў рыхтавалася дрэнна, ня гледзячы на тое, што часу было шмат. Задачы чысткі ня былі папулярызаваны сярод шырокіх працоўных мас, а таму падрыхтоўка да чысткі ня стала магутным фактарам ва ўзьнаўленьні тэмпаў і якасьці уборкі, абмалоту і хлебаздачы.

Уся падрыхтоўчая работа выразілася ў складаньні папяровых характарыстык, прычым гэтае скажэньне інструкцыі па чыстцы ў асобных мясцох прыняла яўна агідны характар — складаючы характарыстыкі, праводзілі папяровую чыстку. У ячэйцы прамарцелай такім чынам выключылі тры члена партыі. Характарыстыкі дваліся па стандартнай анкеце, якая была выпрацавана РКК. Ні ў адной з ячэек ня былі вылучаны самаправерачныя брыгады.

Такая нездавальняючая падрыхтоўка ў першыя дні адбілася на ходзе чысткі (слабая актыўнасьць камуністаў і беспартыйных пры абмеркаваньні дакладаў ячэек і персанальнай праверцы камуністаў — ячэек Бярозінскага сельсавету і саўгасу, яч. Сялібы).

Камісія закончыла праверку 4 ячэек з колькасьцю 50 членаў і кандыдатаў партыі. У ходзе праверкі гэтых 4 ячэек камісіяй ускрыт рад буйнейшых недахопаў. Адзін з галоўных — гэта перагаваньне ячэек і камуністаў па антыдзяржаўным тэндэнцыі асобных калгасаў (у Бярозінскім сельсавеце — **«Дзяржынскага», «Трэці рашаючы»**, у Сялібскім сельсавеце — **«Уперад», «Усход», «Калініна»**). Замест таго, каб першы-ж абмалочаны хлеб здаць дзяржаве, яго раздалі па кулацкаму прынцыпу калгасьнікам.

Камісіяй выключаны з партыі яўныя парушыцелі дырэктыў партыі, дапусьціўшыя антыдзяржаўныя тэндэнцыі. Сакратар Сялібскай ячэйкі **Кучук**, старшыня калгасу Дзяржынскага — **Салавей**, старшыня Бярозінскага сельсавету — **Губіч**, сакратар ячэйкі Бярозінскага сельсавету **Альшэўскі**, які дапусьціў у час вясеньняга севу «очковитрательство» (рапар тавай аб 100 проц. засеве, у той час, калі фактычна быў выканан плян на 84 проц.), а зараз у часе ўборачнай не рэагаваў на разбазарваньне хлеба.

У ячэйцы **саўгасу «Бярэзіна»** выключан з партыі **Багданаў** — яркі выражаны двурушнік, які на словах усюды стаяў за генэральную лінію партыі, а на справе адмаўляўся ўзьдзельнічаць у гаспадарча-палітычных кампаніях, манкіраваў работай. Багданаў ужо раней выключаўся з партыі за адмаўленьне ад паездкі ў вайсковую школу. У гэтай-жа ячэйцы выключан з партыі **Яцук** — старшыня рабкопу, які замест клапот аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня, сыстэматычна п'янствуе, разбазарвае прадукты.

У ячэйцы мілідзі выключан з партыі **Мяшкоў**, які канчаткова разлажыўся.

У праверапых 4 ячэйках выяўлена палітычная нянісьменнасьць і няведаньне асноўных рашэньняў партыі з боку некаторых кіруючых работнікаў. Напрыклад: сакратар Бярозінскай ячэйкі Альшэўскі ня змог адказаць на самыя элемэнтарныя пытаньні са статуту партыі; у яч. саўгасу «Бярэзіна» члены партыі Дзі (інструктар РСІ), Галецкі, Маханек ня ведаюць нават апошніх пастаноў студзеньскага пленуму ЦК. Галецкі былы сакратар ячэйкі, загадчык вінзаводу, ня змог адказаць — хто абірае раённую кантрольную камісію. Гэтыя таварышы камісіяй пераведзены ў кандыдаты партыі, а тав. Далейка добры і прыкладны рабочы, але зусім палітычна нянісьменны, пераведзен з кандыдатаў у спачуваючыя.

Трэба адзначыць, што прайшоўшая чыстка 4-х ячэек паказала, што асноўная частка камуністаў гэтых ячэек аддана і сумленна працуюць. **(Турык, Кільбін, Сарвіра, Вільчынскі, Жданові, Ефіменка і інш.).**

Зараз у выніку пачаўшайся чысткі ў раёне наглядаецца значны зрух у справе выкананьня гаспадарча - палітычных кампаній. Калі на 8-е жніўня раён па уборцы знаходзіўся на 39 месцы ў БССР, то на 18 жніўня ён ужо вышаў на 16-е месца. Плян хлебаздачы да дня прыезду камісіі — 0,2 проц., а на 17-VIII — 12 проц. гадавога пляну. Плян сенанарыхтовак быў 78 проц., зараз 92 проц. Усё гэта за 8-9 дзён ходу чысткі ячэек.

Камісія па чыстцы ўсю сваю работу ўвязвае з ходам уборачнай і здачай збожжа дзяржаве, сочыць за работай кожнага камуніста на гэтых вучастках. Камісія непасрэдна на месцы прымае ўдзел у ліквідацыі прарываў, так, напрыклад: правяраючы месцачковую ячэйку, у якую ўваходзяць некаторыя старшыні калгасаў, камісія выяжджала для праверкі іх на месца работы. Была мабілізавана ўся месцачковая ячэйка на ўборку з поля снапоў, па збор калосьсяў.

Камісія пазачарговa выехала ў Сялібскі і Якшыцкі сельсаветы, дзе зусім дрэнна ішла ўборка і збожжаздача, дзе амаль ва ўсіх калгасах першы хлеб быў разьмяркован калгасьнікам. Гэта ўпачарговая чыстка (па пляну яна была вызначана апошняй), ускалыхнула камуністаў і ў дні работы камісіі па чыстцы ўборалі азімыя, прыступілі да ўборкі яравых і каля 2.000 пуд. збожжа здалі дзяржаве. Камісія на месцы арганізавала насельніцтва на дапамогу калгасам у звозцы жыта з поля, члены камісіі ўзначалілі гэту работу.

Гэтыя мэтады работы камісіі спрыяюць мабілізацыі мас на пасьпяховае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай.

Трэба адзначыць, што галоўны недахоп партыйнай работы ў раёне, гэта слабая работа з аднаасобнікамі. Вынікам гэтага зьяўляецца зусім дрэннае выкананьне аднаасобным сэктарам пляну збожжапаставак. Калі па 18-VIII калгасны сэктар выканаў плян збожжаздачы на 24 проц., то аднаасобны сэктар выканаў толькі на 4 проц. Пры гэтым трэба ўлічваць, што аднаасобны сэктар у раёне складае 63 проц. гаспадарак і ў здачы дзяржаве збожжа займае 50 проц. пляну.

На гэта партыйныя і савецкія арганізацыі павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу і ў бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому.

Н. КЛЕБАНАЎ.
(Член раённай камісіі па чыстцы).

РКК-РСІ—Асіпавічы, Бабруйск, Барысаў, Віцебск, Ворша, Гомель, Жлобін, Заслаўе, Менск, Мазыр, Полацак, Рэчыца, Слуцак

Лістом ЦКК КП(б)Б НК-РСІ Бел. і ЦК ЛКСМБ ад 2-VIII—г. г. вам было прапанавана арганізаваць у найбольш рашаючых пунктах прыёмкі, пагрузкі і пераробкі хлеба стала дзейнічаючыя (на 2-3 месяцы) рабкрыпаўскія і камсамольскія пасты.

Аб праробленай у гэтай галіне рабоце вам было прапанавана кожную пяцідзенку інфармаваць ЦКК.

З прычыны непрадстаўленьня інфармацыі, вам 10-VIII за подпісам майго намесьніка т. Коніка быў паслан паўторны ліст, які, як відаць, пішкага ўзьдзейнічаньня на вас ня меў.

Лічу такія адносіны да выкананьня даручэньня ЦКК недапушчальнымі і нецярпімымі. Прапаную неадкладна выкананьне паказанае даручэньне, інфармуючы ЦКК аб праробленай рабоце кожную пяцідзенку.

Разам з першай інфармацыяй прадстаўце тлумачэньне аб прычынах невыкананьня першага і другога лістоў.

Старшыня ЦКК КП(б)Б
Нарком РСІ Бел. ЛЫЧОЎ.

МАНЭЎР БУНДАЎСКАГА ВОДПРЫСКА

«Трэба мець на ўвазе, — гаварыў тав. Сталін на студзеньскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б), — што рост магутнасьці савецкай дзяржавы будзе ўзмацняць супраціўленьне апошніх рэштак паміраючых клясаў. Іменна таму, што яны паміраюць і дажываюць апошнія дні, яны будуць пераходзіць ад адных форм наскокаў да другіх, больш рэзкіх форм наскокаў, апэлюючы да адсталых пластоў насельніцтва, мабілізуючы іх супроць савецкай улады... На гэтай глебе могуць ажыць і заварушыцца разьбітыя групы старых контр-рэвалюцыйных партый — эсэраў, меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў, могуць ажыць і заварушыцца асколкі контр-рэвалюцый, апазыцыйных элемэнтаў з трацкістаў і правых ухілістаў...».

Ход чысткі партыі поўнасьцю пацьвярджае правільнасьць і своечасовасьць указаньня правадыра партыі тав. Сталіна.

За час чысткі КП(б)Б мы ўжо мелі нямала фактаў, якія паказваюць, што іменна зараз, у часе чысткі партыі, эсэраўскія, меншавіцкія, трацкісцкія, нацдэмаўскія, буйдаўскія элемэнты заварушыліся. Яны актывізуюцца і імкнуцца ўзмацніць сваю барацьбу супроць партыі. Арганізацыяй змоваў супроць чысткі, кругавой парукай яны імкнуцца сарваць работу камісій. Адпаведнай падрыхтоўкай «сваіх» людзей, часта адсталых беспартыйных, яны прабуюць скампрамэтаваць лепшых камуністаў, кіраўнікоў, узьвесьці паклёпы на партыю. Такі факт меў месца, напрыклад, пры чысткі арганізацыі Горанскага сельгасінстытуту, калі былы эсэр Буткевіч арганізаваў змову супроць чысткі. Такія-ж факты былі і ў Полацку і ў Віцебску і г. д.

Апрача гэтага, ёсьць рад фактаў, калі трацкісцкія, буйдаўскія і інш. элемэнты імкнуцца выкарыстаць трыбуну чысткі для абароны сваіх контрэвалюцыйных ідэй, для нападкаў на партыю.

У гэтай сувязі надзвычай важна прывесьці факт, які нядаўна меў месца ў Менску.

У ячэйцы Менгаржылсаюзу чыстку праходзіў член партыі Шапіра. Старшыня камісіі тав. Іофэ задае яму пытаньне: ці быў ён у Бундзе, ці ведае ён што-небудзь пра Бунд і пра бундаўцаў. І тут просіць слова нехта, па прозьвішчы Голуб.

— Навошта вы пытаецеся пра Бунд і бундаўцаў? — зварачаецца ён да камісіі. — Я вось ведаю бундаўцаў па тым, як яны гераічна змагаліся на барыкадах, — і пачаў апяваць «рэвалюцыйнасьць» Бунду. Зразумела, што камісія тут-жа выкрыла «рэвалюцыйныя заслугі» Бунду і яго ярага абаронцы Голуба, на фактах паказаўшы прысутным рабочым, чым па самой справе быў Бунд, як ён змагаўся супроць бальшавікоў і інтарэсы каго ён абараняў.

Характэрным у гэтым факце зьяўляецца тое, што, як высьветлілася, гэты бундаўскі водпрыск — Голуб — аказаўся членам партыі нават ня гэтай ячэйкі, а прышоў сюды для таго, каб тут, дзе яго менш ведаюць, выкарыстаць сход для ідэалізацыі Бунду.

Гэты факт (а такіх нямала) яшчэ лішні раз гаворыць аб актывізацыі розных варожых партыі апартуністычных, нацыяналістычных элемэнтаў, якія імкнуцца выкарыстаць чыстку ў сваіх контр-рэвалюцыйных інтарэсах.

Н—н.

ПРЫВІТАНЬНЕ тав. ГІКАЛО

ад канфэрэнцыі рабочых заводу „Чырвоны мэталіст"

Рабочыя і ІТР заводу «Чырвоны мэталіст» у г. **Віцебску**, сабраўшыся на заводзкую канфэрэнцыю па якасьці выпускаемай прадукцыі пілюць тавар, **цьвёрда-каменнаму бальшавіку, вернаму вучню Сталіна бальшавіцкае прывітаньне.**

Перад намі і нашым заводам стаіць адказная задача пакрыцьця запазычанасьці па выпуску прадукцыі, якую мы маем за 1-е паўгодзьдзе 1933 г. і асабліва—палепшаньне якасьці выпускаемай прадукцыі, каб і гэтым выканаць пастанову ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Чыстка партыйнай арганізацыі, якая ў нас зараз праходзіць, значна узмацніла вытворчую актыўнасьць, у выніку чаго зьменшаны процант браку па ліцейнаму цэху. Але гэта яшчэ зусім недастаткова.

Запэўніваем цябе, што пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі мы прыкладзем усе сілы, каб выканаць тыя задачы, якія ўскладзены на нас па выкананьні прамфінпляну як па колькасных, так і па якасных паказальніках.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з не кіраўніком—тав. ГІКАЛО!

Ад імя канфэрэнцыі — **Прэзыдыум.**

АБ ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ III КВАРТАЛУ 1933 г.

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 22-VIII-33 г.

ЦК КП(б)Б канстатуе, што выкананьне фінансавага пляну трэцяга квартылу знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву. За першыя чатыры дэкады па мабілізацыі сродкаў насельніцтва, плян выканан усяго толькі на 24,8 проц., а па плацяжох агрэматжанага сэктару на 35,1 проц., прычым па цэлым радзе рашаючых плацяжоў, плян выканан толькі ад 8 да 18 проц. (сельгаспадатак, самаабкладаньне).

Асабліва абураюча цягнуць уніз выкананьне пляну раёны: Кармянскі, Брагінскі, Церахаўскі, Чэрыкаўскі, Бешанковіцкі, Веткаўскі, Гарадоцкі, Быхаўскі, Прапойскі, Асіпавіцкі, Вушацкі, Чавускі, Нараўлянскі, Буда-Кашалёўскі і Стара-Дарожскі, выканаўшыя плян ад 3,7 проц. да 12,9 проц., рашаючыя ў выкананьні пляну Магілёўскі і Жлобінскі раёны (16 і 16,9 проц.), прычым большасьць з гэтых раёнаў поўнасьцю правалілі кампанію па сельгаспадатку і самаабкладаньні. Выкананьне на 10 жніўня па гэтых плацяжох менш 6 проц. квартальнага пляну.

У раёнах: Лепельскім, Аршанскім, Асіпавіцкім, Быхаўскім, Бялынічскім, Камарынскім, Старадарожскім і Сурасскім па самаабкладаньні да 10 жніўня не сабрана **ні аднэй капейкі.**

Гэтыя лічбы паказваюць, што кіраўніцтва большасьці рабнаў не зразумела гаспадарча-палітычнага значэньня выкананьня фінпляну і таго, што трэці квартал зьяўляецца рашаючым кварталам першага году другой пяцігодкі, не зрабіла для сябе адпаведных вынікаў з **дырэктыў ЦК і СНК, якія абавязваюць раённыя арганізацыі пастаўіць работу па выкананьні фінансавага пляну на ўзровень важнейшых гаспадарча - палітычных мерапрыемстваў** (уборка, збожжаздача).

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць бюро райкомаў неадкладна на па-за чарговым пасяджэньні заслухаць і абмеркаваць даклад аб ходзе выкананьня фінансавага пляну па раёну і правесьці канкрэтныя мерапрыемствы, забясьпечваючыя выкананьне да 1 верасьня ня менш 70 проц. квартальнага заданьня. На гэтым-жа пасяджэньні заслухаць даклад кіраўніка Дзяржбанку аб ходзе прыцягненьня вольных сродкаў калгасаў па іх бягучых рахунках і арганізацыі сваячасовай здачы ў касы Дзяржбанку паступленьняў па плацяжох і выручкі за рэалізацыю тавараў.

2. Абавязаць райкомы партыі неадкладна праверыць па ўсіх сельсаветах работу па ўручэньні акладных лістоў па сельгаспадатку і паведамленьні па самаабкладаньні, страхоўцы і сельска-гаспадарчым крэдыце, разгарнуўшы масавую кампанію за датэрміновыя ўносы калгасамі, калгасьнікамі і працоўнымі аднаасобнікамі ўсіх плацяжоў, якія з іх прылічваюцца, з ужываньнем мер прымусовага спагнаньня ў адносінах да кулацкіх гаспадарак.

3. Рашаючае значэньне ў выкананьні фінансавага пляну III кварталу маюць паступленьні чарговых узносаў па пазыцы імя 2-й пяцігодкі, якія складаюць каля аднэй трэці ўсяго фінансавага пляну. ЦК абавязвае раённыя арганізацыі зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэты вучастак работы, забясьпечыўшы праверку здачы ўтрыманых узносаў і рэалізацыі назыкі за навіны разрахунак сярод аднаасобнікаў і поўнае выкананьне квартальнага заданьня.

4. Прапанаваць РК КП(б)Б неадкладна дакладкаць мабілізаваных на іншыя кампаніі ўсіх фінбанкаўскіх работнікаў, пераключыўшы іх выключна на ліквідацыю прарыву і поўнае выкананьне фінансавага пляну.

5. За зрыў выкананьня фінпляну і пазьдольнасьць забясьпечыць кіраўніцтва фінансавай работай, зьняць з работы загадчыка магілёўскага райфа Асіпчука, кіраўніка міжраённага аддзяленьня Сацзембанку Кавалёва, забараніўшы т. т. Асіпчуку і Кавалёву на працягу году займаць адказныя кіруючыя пасады. Кіраўніка горацкага аддзяленьня Дзяржбанку т. Сугакова з работы зьняць.

6. Устанавіць на старонках цэнтральнага органа ЦК КП(б)Б «Зьвязда» чырвоную і чорную дошкі па выкананьні фінпляну. Адначасова з занясеньнем на чырвоную і чорную дошкі раёнаў, заносіць персанальна загадчыка райфа, старшыню райвыканкому і сакратара РК КП(б)Б.

Заняцьце на чырвоную і чорную дошкі робіцца рэдакцыяй газэты «Зьвязда» па прадстаўленьні Наркамфіну і заг. агітпасавага аддзелу ЦК.

Распараджэньне наркома юстыцыі і пракурора рэспублікі ўсім пракурорам і нарсудам

За апошні час наглядаецца рад выпадкаў, калі асобныя калгасьнікі і аднаасобнікі, якія працуюць на дагаворных умовах на торфараспрацоўках, па сплаву лесу, на будаўніцтве і інш. самавольна пакідаюць работу, парушаючы заключаныя з адпаведнымі гаспадарчымі арганізацыямі дагаворы. Маюцца факты, калі сплаўшчыкі лесу нават пакідаюць плыты ў дарозе, не даводзячы іх да месца прызначэньня, а ў выніку лес расплываецца і раскрадваецца. Усім гэтым зьвязецца своячасовае выкананьне пляну лесасплаву, торфаздабычы, будаўнічых работ і інш. Між тым, некаторыя пракуроры адмаўляюцца ўзбуджаць справы аб невыкананьні дагавароў.

У адпаведнасьці з распараджэньнем пракурора СССР т. **Акулава** ад 14-га жніўня 1933 г. прапаную:

1. Неадкладна прыцягваць да матар'яльнай і крымінальнай адказнасьці па 252-а арт. КК *) калгасьнікаў і аднаасобнікаў, якія заключылі ўмовы і самавольна пакідаюць работу, у прыватнасьці за застаўленьне плытоў лесу ў дарозе і недастаўку іх на месца прызначэньня.

УВАГА: у тых выпадках, калі застаўленьне плытоў у дарозе было ўтворана з мэтай зьнішчэньня ці расьцяраньня лесу — вішаватыя падлягаюць адказнасьці па закону ад 7-га жніўня 1933 г.

2. Справы афармляць і разглядаць у судох на працягу няці дзён з моманту ўзбуджэньня справы.

3. Кожныя 15 дзён інфармаваць НКЮ аб колькасьці прайшоўшых спраў, колькасьці абвінавальных прысудаў, асуджаных, хто прыцягнут да адказнасьці і канкрэтна за што.

Нарком юстыцыі і пракурор рэспублікі КУЗЬМІН.

*) 252-а арт. КК: «Невыкананьне дагавору з дзяржаўнай, грамадзянскай, або кааперацыйнай установай ці прадпрыемствам, калі пры разглядзе справы ў парадку грамадзянскага судаводзтва ўстаноўлена злосная невыкананьня, выклікае—пазбаўленьне волі да няці гадоў з канфіскацыяй часткі маемасьці, або без канфіскацыі».

Нараду з тым спаталяць неадпрацаваныя авансы (прадукты і тавары).

ВЫКРЫЦЬ „ЦЁПЛУЮ" СЯМЕЙКУ

(Ліст сталоўчыхся)

Сталоўка № 1, у якой харчуецца некалькі соцень чалавек Менскага партактыву, павінна была-б прадаваць на-бальшавіцку і паказваць узоры работы іншым сталоўкам, паказваць, як патрэбна змагацца за смачныя, высокай якасьці і танныя абеды.

Але на жаль, тут гэтага няма. Наадварот, тут ёсьць рад агіднасьцяй, на якіх неабходна спыніцца і да канца выкрыць разбазарваньне грамадзкіх прадуктаў, палажыць канец жульніцкай дзейнасьці сабраўшайся сюды «цёплай кампаніі».

Для атрыманьня харчаваньня, як сталоўчымся так і іх сем'ям, на абеды дамоў выданы спэцыяльныя прапускі. Пры атрыманьні ў касе адрываюцца ад прапускоў адпаведныя нумары. Акрамя гэтага, пры ўваходзе ў сталоўку заўсёды стаіць кантроль, які без пропуску не прапускае. З над ворнага боку ўсё нібы абстаўлена добра...

Але-ж калі паглядзець глыбей, у сярэдзіну, дык атрымліваецца зусім адваротнае. Вось перад намі некалькі дзесяткаў запісак на звычайных кавалачках паперы. Частка з іх за подпісам самога загадчыка сталоўкі —**Руднікава**, частку пісаў, яго нам. **Сагаловіч**, а па прыкладу начальства не лянаваліся пісаць для сваіх прыяцеляў і кладаўшчыкі **Чарапаха** і **Салавей.**

Гэтыя запіскі сьведчаць, што акрамя прымацаваных да сталоўкі тут штодзенна харчуецца каля сотні людзей па-знаёмству. **Вось вам і кантроль.** Запіскі ўзяты толькі з аднэй касы, а ўсіх кас у сталоўцы 4. Адгэтуль мы не памылімся, калі скажам, што ў сталоўцы праз усе 4 касы харчуецца больш за 2 сотні людзей штодзенна, па-знаёмству, па запісках.

Побач з гэтым наглядаецца выдача такім-жа спосабам розных прадуктаў харчаваньня з кладовай на дом. Адсюль зусім ня дзіва, што ў сталоўцы вельмі часта бываюць сьнеданьні і вячэра з меню «па выбару»—толькі кефір і гарбата. Ня дзіва і тое, што за апошнюю дэкаду сталі значна памяншацца порцыі вячэры і сьнеданьня, і асабліва гэта відаць стала на порцыях так званага пірагу. Усё гэта цярпелася таму, што напэўна стаў расьці кантынгент харчуючыхся па запісках.

Нельга абыйсьці і такога агідненьнага становішча, што абеды, адпуска емыя на дом для ўтрымліваў партактыву, недапушчальна нізкай якасьці. Крупнік і боршч амаль ніколі не адпавядаюць свайму названьню.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што ў буфэце сталоўкі растраты. Але-ж «любіцелі» Руднікаў аддаваць яго суд шляк не асьмеліцца, **Руднікаў** усялякімкнецца пазбавіцца ад тых, хто перашкаджае яму рабіць цёмныя справы.

Усіх агідненасьцяй не пералічыш. **Але досыць і гэтых фактаў, каб адпаведныя арганізацыі тэрмінова ўзяліся за аздараўленьне апарату сталоўкі № 1, спынілі разбазарваньне прадуктаў і вінаватых «узнагародзілі» па заслугах.**

РАБОЧАЕ ВОКА і АР. М.

Галавацяпаў з жакту № 55—да адказнасьці

(Ліст спэцыяліста)

У 1930 г. я прыехаў з Верхнядзінску ў Менск на працу у мэдінстытут у якасьці павуковага работніка. Як член жакту, я атрымаў кватэру па Ільінскім завулку, у доме № 11, кв. 3 (ЖАКТ № 55). Ужо не гаворачы аб тым, што гэтая кватэра вельмі цесная, яна настолькі апушчана і раз бурана, што жыць у ёй зусім немагчыма.

Кухні ў кватэры няма і прыходзіцца гатаваць у пэцуны-галянцы, якая дымяць, ад чаго кватэра зрабілася недаўпушчальна чорнай ад капаці. Дах над гэтай кватэрай на столькі разбураны, што нават пры невялікім дажджы кватэру залівае вада. Столь і сьцены заўсёды мокрыя і адвальваецца штукатурка, дзьверы праясьвечваюцца.

Вось ужо 3 гады як я дамагаюся, каб жакт зрабіў хаця-б невялікі рамонт. На мае патрабаваньні і заявы да яго прыходзілі дзесяткі камісій і ўсе яны пісалі акты аб неабходнасьці рамонту. У мінулым годзе па маёй заяве Гаржылсаюз даў распараджэньне жакту, каб зрабілі рамонт у маёй кватэры. Пасьля гэтага ў позьнюю восень жакт прывёз на двор цэглу і гліну, якая палежала да зімы і ўсё гэта было зьвезена назад, а я параўнайшаму застаўся зімаваць з малымі дзецьмі ў халоднай разбуранай кватэры.

Надыходзіць 4 зіма, а аб рамонце маёй кватэры ніхто і ня думае. Я ня раз і ў гэтым годзе пісаў заявы і не раз таварыў з праўленьнем і загадчыкам дамамі аб рамонце,—але ніякай увагі.

Абураючыя адносіны да спэцыялістаў-ударнікаў не павінны больш працягвацца і адпаведныя органы павінны паклясьці гэтаму канец.

ЧУРБАНОЎ.

Ад рэдакцыі: «Зьвязда» ўпэўнена, што гарКК-РСІ паложыць канец бяздушным адносінам да спэцыялістаў.

№ 55—да адказнасьці

(Ліст спэцыяліста)

і ўсе яны пісалі акты аб неабходнасьці рамонту. У мінулым годзе па маёй заяве Гаржылсаюз даў распараджэньне жакту, каб зрабілі рамонт у маёй кватэры. Пасьля гэтага ў позьнюю восень жакт прывёз на двор цэглу і гліну, якая палежала да зімы і ўсё гэта было зьвезена назад, а я параўнайшаму застаўся зімаваць з малымі дзецьмі ў халоднай разбуранай кватэры.

Надыходзіць 4 зіма, а аб рамонце маёй кватэры ніхто і ня думае. Я ня раз і ў гэтым годзе пісаў заявы і не раз таварыў з праўленьнем і загадчыкам дамамі аб рамонце,—але ніякай увагі.

Абураючыя адносіны да спэцыялістаў-ударнікаў не павінны больш працягвацца і адпаведныя органы павінны паклясьці гэтаму канец.

ЧУРБАНОЎ.

Ад рэдакцыі: «Зьвязда» ўпэўнена, што гарКК-РСІ паложыць канец бяздушным адносінам да спэцыялістаў.

ДА АСЕНЬНЯ ЗІМОВЫХ—НЕ ГАТОВЫ

Ст. Ворша-ўсходняя зьяўляецца рашаючым вучасткам Аршанскага вузла. Праз яе праходзіць значны паток грузаў.

Як-жа кіраўніцтва станцыі і камэрцыйная частка раёну забясьпечыў базавую сустрэчу асеньня-зімовых перавозак?

Брыгада «Зьвязды» і «Бальшавіцкага сьцягу» сутыкнулася з яўнымі фактамі апартуністычных і безадказных адносін у падрыхтоўцы да гэтага адказнейшага пэрыяду.

Кіраўнікі станцыі (т. т. **Дравасекаў, Ганахоў, Маленчанка**) і камэрцыйная частка раёну (тав. **Карпушчанка**) ня ўзялі пад штодзенны кантроль справу падрыхтоўкі, у выніку чаго плян выкананы толькі на 40 проц.

Камэрцыйная частка раёну і кіраўніцтва станцыі да гэтага часу не адвялі пакгаўзу для «Загатзбожжа».

Пакгаузы закіданы розьнымі грузамі, сярод якіх некаторыя ляжаць па некалькі месяцаў. Кіраўніцтва станцыі ня прымае ніякіх мер да ліквідацыі такога становішча.

Для агнянебясьпечных грузаў асобнага памяшканьня няма і яны ляжаць разам з іншымі грузамі.

Месцам для сартоўкі, прыёмкі і адпраўленьня грузаў станцыя не забясьпечана. Наўная сартовачная пляцформа не адпавядае патоку грузаў. Будаўніцтва намечанай на пляну пляцформы і пад'езду для цяжкіх грузаў сарвана на віне нач. камэрцыйнай часткі раёну тав. **Карпушчанка** і нач. 6-й дыстанцыі **Касарэвіча**, на віне апошняга на станцыі Ворша-ўсходняя нават ня прыступлена да пабудовы водаадводу і ўкладкі стрэлак на шчабенку, што зрывае своячасовы пуск электрацэнтралізацыі і пагражае бясьпечнасьці руху.

Пад'езд да навалачнай пляцоўкі на віне **Карпушчанка, Касарэвіча і Дравасекава не пабудован і ўвосень немагчыма будзе да ле пад'ехаць.**

Папярэджваючыя сьцяглавыя сыгналы, якія павінны быць устаноўлены да 15 ліпеня—да гэтага часу не устаноўлены.

Пагражаючае становішча і з асьвятленьнем. Парк станцыі асьветлен слаба, трэці стрэлачны раён — бальш вучастак работы зусім не асьветлен; дрэнна асьветлена навалачная пляцоўка.

Тэлефонная сувязь паміж станцыяй Ворша-ўсходняя і горадам ня існуе.

Станцыя не забясьпечана вагаўшчыкамі. Нават зараз, пры меншым патоку грузаў, не хапае 5 вагаўшчыкоў, а што-ж атрымаецца пры пераходзе на кругласутачную работу?

Кваліфікацыя наяўных вагаўшчыкоў зусім нізкая. Курсы для павышэньня кваліфікацыі ня створаны. Маруда праходзіць падрыхтоўка кадраў для электрычнай цэнтралізацыі. Начальнік станцыі Ворша-ўсходняя тав. **Дравасекаў** і яго намесьнік тав. **Маленчанка** зусім не займаюцца пытаньнем падрыхтоўкі кадраў.

Не аддаецца ўвагі пытаньням паляпшэньня бытавых умоў рабочых і грузчыкаў з боку кіраўніцтва станцыі і пагрузачна-разгрузачных работ (тав. **Фрыдлянскі**).

Да будаўніцтва баракаў для грузчыкаў не прыступлена.

Такой апартуністычнай бязьдзейнасьці і безадказнасьці ў рабоце кіраўнікоў станцыі ў часе асеньня-зімовых перавозак трэба пакласьці канец.

Канкрэтныя вінаватыя ў зрыве работы станцыі: **Карпушчанка, Дравасекаў, Ганкоў, Фрыдлянскі** павінны панесьці суровае пакараньне.

Брыгада «Зьвязды» і «Б.С» **Рутман, Валозін, Андрушына, Садзікаў, Краштаповіч, Масвіціс, Лапіцкі.**

Я. Бранштэйн

ТВАРАМ ДА ЧЫТАЧА МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Аб выключным грамадзка-выхаваўчым значэньні мастацкай літаратуры буржуазныя і дробна-буржуазныя культуртэгеры гаварылі нямала і нанішліва, пры ўсякім эручным і нэручным выпадку.

Скромна замоўчвалі толькі аб тым, што ва ўмовах панаваньня грашовага мяшка мастацкая літаратура — тэма высокапаважаны «падручнік жыцьця» становіцца падручнікам экспляататарскай хлусьні і вырваднушка; замоўчвалі аб тым, што цэнзурай, толадам і турмой буржуазнае грамадзтва заўсёды марыла тых «настаўнікаў жыцьця», якія ўздумвалі мастацкім словам вучыць не таму, што выгадна біржы; замоўчвалі аб тым, што «нацыя», якая падлягала выхаваньню сродкамі мастацкага слова—дзесяткі, сотні мільёнаў чытачоў з рабочых, сялян і калёніяльных рабоў — тамілася ў голадзе, галечы і бескультурнасьці, пакідаючы права мець асалоду ад мастацкай літаратуры «сумуючым і церпячым ад жэрэньня верхнім дзесяці тысячам» (Ленін).

Лепшыя прадстаўнікі радыкальнай дробнай буржуазіі ва ўсе часы даказвала бачылі гэтыя «пажыцьці», разумелі абураючую недарэчнасьць гэтага і са страхам гаварылі аб будучай «немсьце» гэтага масавага чытача.

Віктару Гюго здавалася нямінучым, што прыход гэтых мас да палітычнага, а, значыцца, і да культурнага панаваньня будзе суправаджацца масавым спаль ваньнем каштоўнейшых бібліятэк. Нават Генрых Гэйнэ пашуа прадракаў, што гэтыя будучыя «мрачные иконоборцы» сваімі грубымі рукамі высякуць яго паэтычныя алеандравыя гаі, а ў лісты яго «Книги песньяў» старухі сацыялістычнай будучыні будуць закручваць каву.

Полымя фашысцкіх вогнішчаў на бацькаўшчыне Гэнрыха Гэйнэ дае сапраўды, у простым сэнсе гэтага слова, новае «асьвятленьне» вышэйсказанага прадбачаньня.

Загніваючая буржуазная культура зводзіць сваіх мастакоў да узроўню цывілізаваных «бандытаў пяра», поўзаючых лёкаяў; лешых майстроў культуры яна ператварае ў сваіх лютых ворагаў, праследуе і спальвае іх творы; мракабесьсе, ханжаства і бранізваны фашысцкі кулак, адпачаюць яе прадсьмяротныя гадзіны.

А ў краіне сацыялізму, у далёкай Сібірскай тайзе (як аб гэтым расказваў у «Известиях» А. Атрановскі), у глухой начной старожцы 14-гадовая дачка вартаўніка камуны «Майское утро» чытала і ведае абодвых вялікіх Гэнрыхаў — Гэнрыха Гэйнэ, і Гэнрыха Ібсэна. І ня блытае іх.

У глухім сельсавеце Кармянскага раёну, дзе, як кажуць, ня ведалі да рэвалюцыі аб ужываньні штаноў (хадзілі ў палатняных доўгіх кашулях), хлопчык гадоў 10-ці гэтай зімою гадзінамі чытаў мне на памяць вершы Чарота, Александровіча і Купалы. У апошнім думары «Литературной газеты» ёсьць паведамленьне аб тым, што на Урале **60-гадовая работніца** Караванава здала у друк аповесьць-хроніку «Маё жыцьцё». **Да рэвалюцыі Караванава была няпісьменнай.**

Сотні тысяч бібліятэк і перасовак, якія расьсеяны па ўсяму нашаму Савецкаму саюзу; мільёны чытачоў, якія прагавіта цягнуцца да мастацкай кнігі; нябачаны масавы «ход» пачынаючых пісьменьнікаў з далёкіх «мядзьведжых куткоў» — усё гэта факты.

Гісторыя чалавецтва ня ведала такога творчага ўздыму мас, як і ня ведала нячуванага ў сьвеце энтузіязму будаўніцтва сацыялізму, як і ня ведала нябачанай у сьвеце бальшавіцкай партыі, якая кіруе гэтым будаўніцтвам і ленінскай культурнай рэвалюцыяй.

II.

Усё гэта факты.

Але ёсьць яшчэ факты. Факты, аб якіх гаворыцца ў пастанове ЦК КП(б)Б «Аб стане бібліятэчнай справы і кнігагандлю ў БССР», — факты, з якімі пам, літаратурным работнікам, даводзіцца ня раз сустракацца. Клясавы ворас, які дзе-ні-дзе засеў у нашых бібліятэках, вычышчае клясыкаў марксізму і ленінізму, вычышчае савецкую літаратуру, навідаючы нацыянал-дэмакратычную літаратуру і кампідкты часопісяй «Нивы» часоў расійска-японскай вайны.

На фабрыцы «Дзьвіна» ў Віцебску я ня здолеў сабраць актыву чытачоў, бо... яго няма. У фабрычнай бібліятэцы ценькая пара палічак беларускай савецкай літаратуры. Не праводзіцца гутарак з чытачамі. Няма ўліку чытаемасьці кніжкі і водгукаў чытачоў. Але-ж на фабры

У ТАЛАЧЫНЕ НЕ БЕРАГУЦЬ УРАДЖАЮ

ЗАХАВАЦЬ КОЖНЫ КОЛАС, ПА-БАЛЬШАВІЦКУ АРГАНІЗАВАЦЬ АБМАЛОТ І ПАСТАЎКУ ЗБОЖЖА

ЧАМУ МАУЧЫЦЬ МАЛАТАРНЯ

Поўдзень. Сонца ад самай раніцы ні разу не схавалася за хмару. Добрае, гарачае надвор'е.

А ў калгасе **«НОВЫ БЫТ»**, Яромкаўскага сельсавету ціха і спакойна. Тамсям бяз усякай справы блукаюць калгасьнікі. Часамі зьбяруцца, сядуць, закураць і пачынаюцца гутаркі.

Моўчкі **СТАЯЦЬ** пад навесьцю **ТРЫ ТРАКТАРЫ.** Моўчкі **СТАЯЦЬ МАЛАТАРНЯ.** Яе рухавік — электраматор — пад замком. А **СТАРЧАНКА** — упаўнаважаны з Менску па электрамалацьбе — бяз усякай справы разгульвае па калгасу. Брыгадзір-жа **КУРТАСАЎ** сьпіць у хаце, схаваўшыся ад сонца.

І так — ужо чацьверты дзень. Стаяць трактары, стаіць малатарня. Ток не ачышчан, а навокал — горы неабмалочанага збожжа.

— У чым справа?

— Няма старшыні калгасу. Ён у Воршы, — апраўдваецца Старчанка, — а бяз старшыні мы малаціць ня можам!

— Што-ж робяць брыгадзіры?

У гутарку ўмешваецца Куртасаў. Адказ брыгадзіра Куртасава гаворыць сам за сябе.

— Малаціць яшчэ рана...

Між тым па палёх стаяць сотні копаў зусім сухога жыта. Збожжа перасыхае і асыпаецца.

Толькі тады, калі ў калгас «Новы быт» прыбыў начальнік палітаддзелу раённай МТС тав. Разумаў, Куртасаў і Старчанка заварушыліся.

І тут аказалася, што для абслугоўвацьня малатарні... няма людзей, няма каму працаваць. Калгасьнікі невядома куды разышліся.

Ім проста надакучыла пяты дзень сядзець без работы і бясплённа чакаць нарадаў. А лодырам такое становішча тым больш на руку.

Чатыры дні асыпалася высушанае збожжа, чатыры дні стаяла малатарня, а Куртасаў і Старчанка ніяк не сабраліся даць нарады калгасьнікам на работу, расставіць людзей на малацьбе.

Брыгадзір Куртасаў — махровы падкулачнік. Ён шырока адчыняе дзьверы калгасу для розных антысавецкіх і кулацкіх элемэнтаў, якія ўцяклі з высылкі. У палоне кулацкага ўплыву знаходзіцца і ўпаўнаважаны з Менску Старчанка, які пакрывае цёмныя справы брыгадзіра.

Адсюль і вынікі. Трактары стаяць ужо больш тыдня, а глеба пад азімыя не падрыхтавана, ворыва не распачата.

Кулацкія прыхвасьні, якія пралезьлі ў кіраўніцтва калгасу «Новы быт», павінны быць прыцягнуты да найстражэйшай адказнасьці.

В. Д.

ВОРША.

ГЕРОІ АЛІЛЮЙСКІХ ДЭКЛЯРАЦЫЙ

ТАЛАЧЫН. (Ад нашага карэспандэнта).

Сельсаветы — Няклюдаўскі, Бруцкі, Мархлеўскі і іншыя сьпяшаюцца рапартаваць аб сканчэньні ўборкі.

Ня верце! Гэта ня больш, як пустыя алілуйскія дэкляцыі.

Вазьмеце хоць-бы Няклюдаўскі сельсавет. Зжатае збожжа і на сёньняшні дзень знаходзіцца на палёх. Збожжа перасыхае, асыпаецца, пачынае прарастаць. Снапы параскіданы. Не адзін гэктар не заскірдован.

Жнівяркі працавалі бяз зерняўборкі. Зжатыя палі густа ўсеяны нязжатымі каласамі. Іх ніхто не падбірае. На палёх калгасаў «Чырвоны барацьбіт», «Ударнік» і «12 зьезд КП(б)Б» ходзяць невядомыя асобы. Зьбіраюць каласы, крадуць збожжа, а праўленьні калгасаў нічога, так сказаць, ня бачаць.

Нідзе не арганізаваны зграбаньне каласоў і сваячасовая звозка зжатага ўраджаю. На кожны зжаты гэктар траціцца ў сярэднім па адным і больш цэнтнэраў збожжа. Яшчэ большыя страты ў калгасе імя 6-та зьезду Саветаў, дзе яны дасягаюць 2-х цэнтн. на кожны гэктар.

Кулакі беспакарана раскрадваюць ураджай. І калі злодзея зловяць, дык адразу... адпускаюць. Адзін характэрнейшы факт. У калгасе «12 кастрычнік» кулак Майзахаў кожны дзень краў калгаснае збожжа з поля. Нарэшце, яго злавілі на месцы злачынства. Злавілі і... адпусьцілі. Злодзей не панёс ніякага пакаранья.

Замест умацаваньня калгаснай брыгады, замест правільнай арганізацыі працы ў брыгадных зьвеньнях, у раёне у цэлым радзе калгасаў сталі на шлях яўна кулацкай практыкі. Калгасныя масывы падзелены на паасобныя палоскі і іх убіраюць па дварох. У калгасе імя 6-та зьезду Саветаў, напрыклад, палова калгаснага збожжа зжата і ўбрана ў адпаасобным парадку. Такія факты ёсьць і ў іншых калгасах.

Найбольш пагражаючы вучастак, паўтараем, — звозка, скірдаваньне і абмалот. У калгасе «Чырвоная зорка» зжатае жыта пакінута на полі і цяпер яно пачало прарастаць. Скірдаў ня ўбачыш. Дзяржаве яшчэ ня здан ні адзін кілёграм. А на авансы пасьпяшылі раздаць звыш 20 проц. абмалочанага збожжа.

У саўгасах Райцы, Усьвіж-бук і калгасе «Першы май» практыкуецца кулацкая «агранамія». Тут заяўляюць, што збожжа трэба вязаць у снапы толькі на чацьверты дзень жніва. Так і робяць. Сажнуць і збожжа валяецца некалькі дзён ня зьвязаным у снапы. Злачынства!

Ёсьць спробы ашукаць дзяржаву, здаць на прыёмачныя пункты нікуды нівартае збожжа.

Старшыня калгасу «Новы сьвет» наўмысна пакіраваў на прыёмачны пункт збожжа, напалову зьмешанае са сьмецьцем. Ні сельсавет, ні партыйная ячэйка не прыцягнулі гэтага буржуазнага перараджэнца да адказнасьці.

Улік пастаўлен зусім дрэнна. У цэлым радзе калгасаў, напрыклад, у калгасе «Першы май», Новасельскага сельсавету вось ужо тры тыдні, як працадні зусім не запісваюцца. Усё пераблытана. Ніхто з калгасьнікаў ня ведае колькі ён выпрацоўвае, колькі ў яго працадзён.

Усе гэтыя факты добра вядомы і райкому партыі, і райвыканкому. Але яны ня прымаюць, літаральна, ніякіх мер.

Іншая справа захапіла раённых кіраўнікоў. Яны пагпаліся за «рэкордамі», за голай лічбай на шкоду жакасьці.

Паводле пастановы райкому асноўная маса збожжа павінна быць здана ў жніўні: ня менш 60 проц. усяго гадавога пляну па цьвёрдых збожжапастаўках.

Цяпер, праўда, райком скасаваў свае ўра-лявацкія тэрміны. І толькі. На гэтым пастаўлена крапка. Па-ранейшаму ні райком, ні райвыканком нічога ня робяць, каб спыніць тыя злачынствы, якія дапускаюцца ў паасобных сельсаветах.

Па-ранейшаму раённых кіраўнікоў ніколькі ня турбуе, што збожжа валяецца на палёх і прарастае, што ні адзін калгас ня прыступіў да скірдаваньня, што барацьба са стратамі зусім не арганізавана.

Ганебная, палітычная блізарукасьць! Ганебная клясавая сьляпата!

А. Ч.

Здаваць дзяржаве сухое і чыстае збожжа!

Закон аб ахове ўраджаю зараз як ніколі павінен знайсьці свой адбітак у рабоце калгасаў і саўгасаў. Убраць збожжа, зьберагчы яго ад раскрадваньня, зьвесьці да нулю процант страт. Трэба зьберагчы збожжа ад псаваньня, перад тым як здаваць яго на элеватары, на склады. Неабходна дасканалая прасушка і сартоўка зерня.

Прыкладам уважлівых і беражлівых адносін да збожжа зьяўляецца Феодосійскі саўгас (Крым).

НА ЗДЫМКУ: сартоўка здаваемага збожжа пры элеватары на ст. Грамацікава.

Аднаасобнікі Карчоўскага сельсавету выканалі гадавы плян па збожжапастаўках на 85,9 проц.

ХОЙНІКІ, 23. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

На ініцыятыве палітаддзелу камсамольскія ячэйкі ў Алексіцкім і іншых сельсаветах арганізавалі грамадзкія інспэкцыі па жакасьці.

Інспэкцыі паладзілі шырокі грамадзкі кантроль ня толькі за якасьцю ўборкі і абмалоту, але і за якасьцю збожжапаставак. Работа інспэкцый па якасьці бліскуча сябе апраўдала. Ранейшыя выпадкі дастаўкі на пункты сырога збожжа зусім спыніліся. Калгасы і аднаасобнікі здаюць дзяржаве высокаякаснае збожжа першага гатунку.

Да 20 жніўня калгасы раённай МТС выканалі гадавое заданьне па цьвёрдых збожжапастаўках на 53,0 проц. Раённы гадавы плян па цьвёрдых збожжапастаўках выкананы на 44,4 проц. Аднаасобнікі выканалі свае гадавыя абавязацельствы на 38 проц. Паасобныя сельсаветы адолелі па-бальшавіцку арганізаваць збожжапастаўкі па аднаасобных гаспадарках. У Карчоўскім сельсавеце гадавое заданьне па цьвёрдых збожжапастаўках аднаасобнікі выканалі на 85,9 проц.

ДАШКЕВІЧ.

ЦАНА КАПЕЕЧНАЙ СПРАВЫ

Дзень і ноч знаходзіцца калгасьнікі ля малатарні ў калгасе імя Дзяржынскага. Малацьба ідзе трэція суткі. Абмалочана-ж вельмі мала. Малатарня дае ў сярэднім па 4-5 тон меншы супроць мінімальнай устаноўленай нормы.

Чаму?

Механік ня столькі працуе, колькі стаіць. Прапрацуе гадзіну-дзьве і зноў прастой, зноў бясконцы паўторны рамонт.

Вінаваты, аднак, не машына. Вінаваты людзі.

16-та жніўня ў калгас імя Дзяржынскага прыбыла зусім спраўная малатарня. У першы дзень малатарня працавала без перабою. Ні адной мінуты прастояў! Намалаціла за дзень 14.000 кгр.

А праз дзень малатарня стала здаваць. Машыніст Цімошін не аглядзеў машыны, ня змазаў падшыпнікаў. Яны загарэліся. Гэта заўважылі, але ня выправілі і малацьба шла далей. Ня дзіва, што хутка малатарня спынілася. За суткі намалаціла толькі 2.500 кгр. збожжа.

Надзвычайнасьць, безадказныя адносіны да малатарні — вось чаму калгас намалочвае ня больш 2—2.500 кгр. збожжа за суткі.

У калгасе «Расьсьвет» пры малацьбе перагарэлі правады: ня было ізаляцыі. Трактары прастаялі два дні. А набыць ізаляцыю — капеечная справа.

Капеечная справа, а як дорага яна каштуе і толькі таму, што аб ёй забываюць!

Пяць трактараў і 4 малатарні прастойваюць у Паселіцкім сельсавеце з-за розных такіх непаладкаў. Іх можна і трэба зьнішчыць на-хаду ў гэту-ж мінуту, але дырэкцыя Хойніцкай МТС ня турбуецца. Яна пакідзілася з аварыямі і прастоямі. Яна ня бачыць, што капеечная справа вырастае ў тысячы рублёў.

ДАШКЕВІЧ.

ХОЙНІЦКІ раён.

Агляд друку

Газэты абавязаны ўзначаліць усебеларускую пераклічку па спаборніцтву з Заходняй вобласьцю

«УДАРНАЯ І СУМЛЕННАЯ ПРАЦАЙ ДАБ'ЕМСЯ ПЯРШЫНСТВА Ў САЦСПАБОРНІЦТВЕ З ВЯЗЕМСКІМ РАЁНАМ».

Такім заклікам адгрывае аршанскі **«Ленінскі прызыў»** ўсебеларускую пераклічку па лепшае правядзеньне ўборкі і збожжапаставак. Адна з галоўных практычных задач сацыялістычнага спаборніцтва:

«НАШ АРШАНСКІ РАЁН ПАВІНЕН ЗМАГА�ЦЦА ЗА 26.300 ГА АСЕНЬНІХ ПАСЕВАЎ, З ЯКІХ АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ 2.000 ГА».

Газэта правільна ўвязвае задачу пасьпяховага сканчэньня ўборкі з высокаякасным правядзеньнем асеньняй сяўбы.

«Ленінскі прызыў» на жывых канкрэтных прыкладах барацьбы калгасу «XIII зьезд КП(б)Б», Якаўлевіцкага сельсавету, паказвае бліскучыя рэзультаты ўдарнай працы на сацыялістычных палёх.

«ВАГА СЁЛЕТНЯГА ПРАЦАДНЯ — 5 КГР.».

А ў мінулым годзе на працадзень прыпадае збожжа 1,6 кг.

«Сёлета працадзень важыць у тры разы больш, чым леташні».

Вось калгасьнік **Андрэй Ханюкоў.** Да ўступленьня ў калгас ён быў бедняком. Ледзь хапала хлеба да зімы, а вясной прыходзілася з дзецьмі ісьці ў пастухі.

«Цяпер Ханюкоў атрымае 265 пуд. збожжа. — І бульбы нажа ён—прыдзецца ня мала, хоць яшчэ не падлічылі, расьце яна ў нас, як на добрым агародзе».

Такім чынам, былы бядняк Ханюкоў становіцца заможным. Варта працаваць для гэтага, не шкадуючы сіл. У калгасе збываецца тое, аб чым ён мог толькі марыць.

У радзе карэспандэнцый з калгасу **«Чырвоны бераг»**, Багушэўскага сельсавету «Ленінскі прызыў» дае паказ барацьбы за першынства ва ўборцы і збожжапастаўцы. Тут і пільная ахова ўраджаю, высокаякаснае жніво ішаніцы, круглосутачны абмалот. Якасьць уборкі — галоўнае зьвяно і таму ў калгасе па сьлядох жней пусьцілі піанэрскі атрад.

«Дзіцячыя зьвеньні збышлі ўсе жытныя палі, прычым якасьць падборкі калосаў настолькі добрая, што на полі не застаўся ніводнага коласа. Пасьля звозкі снапоў з поля дзеці яшчэ раз абыйдуць усе жытныя палі і ячменішчы».

Пад загалоўкам **«І дзяржаве здамо і для сябе ўдосталь хопіць»** газэта дае малюнак ударнай работы на жніве ў калгасе імя Сталіна, Дуброўскага сельсавету. Значна лепш, чым летась, ва ўпчыльненыя тэрміны, спрытна і ўважліва праведзена ўборка. Выключна высокі ўраджай натхняе, падбадзёрвае калгасьнікаў.

«Чаго варта адна ярына. Цыбаты ячмень шуршыць важкім калосьсем, нагінаючы свае доўгія вусы ў пояс да зямлі. 9 цнтн. з га. Ніколі гэта ня было ў калгасе. Або возьмем пшаніцу — 11 цнтн. Гэтыя цяжкія коласы, гэты багаты ўраджай — узнагарода зямлі за пашану, за пённую працу».

Паказваючы на сваіх старонках сацспаборніцтва сельсаветаў, калгасаў і брыгад за хуткую ўборку і пастаўкі, «Ленінскі прызыў» не аддае патрэбнай увагі якасьці ўборачных работ і паставак. Характэрны прыклад. 10 жніўня быў арганізаван вялікі чырвоны абоз. Рад калгасаў даставілі збожжа новага ўраджаю на гарадзкія прыёмачныя пункты. Прычым паасобныя калгасы даставілі збожжа ніякай якасьці, нягодзнае.

«Калгас «Чырвоная Беларусь» прывёз тону сырога жыта. Калгас «Х-ты зьезд» прывёз 2 цнтн. дрэннага «збожжа. Калгасы «Ленінскі прызыў», імя Сталіна, «Пралетары» так сама прывезьлі вільготнае збожжа».

Замест таго, каб ударыць па кулацкіх спробах зрыву паставак, замест таго, каб выкрыць «рокордсмэнаў», якія гоняцца за толькі процантамі, на шкоду якасьці, газэта штампуе гэтыя факты, становіцца ў позу пасыўнага наглядальніка.

Яшчэ адна вялікая памылка газэты. «Ленінскі прызыў» не арганізаваў адна асобнікаў на сацспаборніцтва з Заходняй вобласьцю, на актыўны ўдзел у пераклічцы. Ён ігнаруе аднаасобны сэктар, забываючы, што ўдзельная вага аднаасобнікаў у сельскай гаспадарцы Аршаншчыны яшчэ вельмі вялікая.

«Ленінскі прызыў» павінен шырока скарыстаць усебеларускую пераклічку для далейшага ўздыму сацспаборніцтва, на старонках газэты арганізаваць шырокі абмен лепшым вопытам уборачнай кампаніі. Усебеларуская пераклічка павінна стаць вагаром перамогі ў сацспаборніцтве за танаровае месца на ўсесаюзнай чырвонай дошцы.

* * *

Перад намі яшчэ дзьве раённыя газэты: Рагачоўскі **«Камунар»** і Ельскі **«Бальшавіцкі змагар».**

Абедзьве газэты ня ўключыліся ў сацспаборніцтва БССР з Заходняй вобласьцю. Яны не арганізавалі на сваіх старонках узаемаправеркі выкананьня дагавораў па сацспаборніцтву, не паказалі якімі мэтадамі, якімі шляхамі завабіваюць перамогу перадавыя сельсаветы, калгасы і брыгады. Усебеларуская пераклічка яшчэ не закранула гэтых газэт. Яны маўклівa праходзяць міма гэтай важнейшай ініцыятывы, заклікаў яшчэ вышэй узьняць сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва.

«Бальшавіцкі змагар» не зрабіў належных урокаў з агляду «Зьвязды» — «Мімаходам», зьмешчанага ў пачатку жніўня. У гэтым агляде было выкрыта на падкрэслена, што газэта забыла пра сацыялістычнае спаборніцтва з суседнім Лельчыцкім раёнам.

Баявая задача ўсяго раённага і абласнога друку — шырока арганізаваць пераклічку — абмен вопытам ударнай работы. Газэты павінны вучыць масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў, як завяёваць перамогу ў барацьбе за бальшавіцкі ўраджай. Зараз наступіў рашаючы этап сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба скарыстаць пераклічку для шырокага паказу і ўзаемнай праверкі барацьбы па стратам па ўсіх зьвеньнях гаспадаркі. Трэба на старонках газэт паказаць, як праведзена жніво, ці добраякасна вязаліся снапы, наколькі дакладна праведзен абмалот, як арганізаваны сьціртаваньне і дастаўка збожжа на прыёмачныя пункты.

Асабліва важнае значэньне набывае злучэньне задачы ўзорнага завяршэньня ўборкі з барацьбой за заваяваньне высокага ўраджаю ў 1934 г.

«Усяць у будучым годзе ўраджай і даходы на працадзень яшчэ большыя, чым у цяперашнім — гэта цэнтральны лёзунг новага этапу сацспаборніцтва, які зараз пачынаецца» **(«Праўда»).**

Два калгасы

Два суседы. Два вынікі. Калгасы «Росквіт» і «Бальшавік», Барысаўскага раёну. Адзін знаходзіцца ад другога на адлегласьці 2,5 клм. Колькасьць гаспадарак, глебавыя ўмовы — амаль адны і тыя-ж. А якая розьніца ў рабоце!

Старшыня калгасу «Бальшавік» — камуніст Міхась Дубень. Сапраўдны калгасны арганізатар. Пад яго кіраўніцтвам работа кіпіць. Кожны ведае сваё месца. Над якасьцю работы кожнага арганізаваны самы пільны кантроль.

20 жніўня. Мы на палёх калгасу «Бальшавік».

Брыгады завяршаюць уборку аўса. 7 калгасьнікаў па самі параконных плугох узорваюць апошнія гэктары пад азімыя. 12 калгасьнікаў — ля конных малатарань. 5 калгасьнікаў павезьлі здаваць абмалочанае збожжа ў Барысаў.

Ні аднаго прагульшчыка. Усе працадзельныя як адзін на рабоце.

Характэрная дэталь, якая сьведчыць аб энэргічных клопатах калгасьнікаў пра калгасны ўраджай. У калгасе не хапіла ўтнасьняў. Калгасьнікі не сядзелі склаўшы рукі. Быў арганізаваны масавы збор торфу. І цяпер у калгасе па-баявому разгорнута тарфаваньне глебы пад азімыя. 10 гэктараў ужо утноены.

Калгасная зямля плоціць за сумленную працу высокім ураджаем. Калгас зьбірае ў сярэднім па 12 цэнтн. збожжа з аднаго гэктара. Пасьля выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай па цьвёрдых збожжапастаўках і сэмяны фондаў на адзін працадзень у калгасе «Бальшавік» толькі аднаго жыта прыпадае па тры кілёграмы.

«Бальшавік» заключыў сацыялістычны дагавор з калгасам «Чырвоная зорка» на лепшае правядзеньне ўборкі і збожжастачы. Свае абавязацельствы калгас «Бальшавік» з гонарам выконвае. Жыта ўбрана за 4 дні. Зжат таксама ўвесь ячмень. Завяршаецца ўборка аўса. Калгас ужо выканаў звыш 50 проц. гадавога пляну па цьвёрдых збожжапастаўках. Уся глеба пад азімыя падрыхтавана. Калгасьнікі прыступілі да сяўбы.

Як працуе сусед «Бальшавіка» калгас «Росквіт»? Тут зусім адваротны малюнак. Тры малатарні ёсьць у калгасе «Росквіт», а працуе толькі адна. Чаму? Калгас мае ўсе ўмовы і абавязан поўнасьцю нагрузіць кожную малатарню, і калі гэта ня робіцца, дык толькі з-за апартуністычнай бязьдзейнасьці праўленьня калгасу.

На кулацкую сьцежку сталі кіраўнікі калгасу «Росквіт». Яны сьвядома распальваюць кулацка-спажывецкія настроі. Намалацілі жыта і адразу амаль усё раздалі па авансы. Дзяржаве па цьвёрдых абавязацельствах здалі ўсяго толькі 2,5 цэнтн., а па авансы — звыш 16 цэнтнэраў збожжа.

Авансы раздаюцца па кулацкаму прынцыпу. І заўзятаму лодыру і сумленнаму калгасьніку-ўдарніку — адноўкавая колькасьць збожжа.

Кулацкая ўраўнілаўка дае свае вынікі. Дысцыпліна расхістана. 20 жніўня было добрае сонечнае надвор'е, а па работу вышла куды менш за палову працаздольных калгасьнікаў. Ня дзіва, што ў калгасе зрываецца ўборка. Авёс перастойвае на карню, а ўборка яшчэ нават не пачыналася. Асыпаецца на карню і ячмень.

Аб становішчы з сяўбой красамоўна сьведчыць наступны факт. У праўленьні нам заявілі:

— Сеяць пачнем не раней 27 жніўня.

Усё гэта бачаць Выдчанскі сельсавет і мясцовая партыйная ячэйка, але яны маўчаць.

П. ВОЛЬНЫ.

ПАМЫЛКІ НЯ ВЫПРАЎЛЕНЫ

КЛІМАВІЧЫ.

Клімавіцкія рэкордсмэны ня сьціхаюць. У цэлым радзе калгасаў па-ранейшаму ня спыняецца пагоня за «рэкордамі», за голай лічбай. Як і раней якасьць уборкі — самы закінуты вучастак.

Асабліва адзначаецца Судзілаўскі сельсавет. У гэтым сельсавеце ўборка праводзіцца абы-як.

У калгасе «Чырвоны маяк» на кожны квадратовы мэтр траціцца 25 грамаў збожжа. А ў цэлым пры ўборцы 62 гэктараў ячменю страчана каля 160 цэнтнэраў.

Раённыя арганізацыі павінны, нарэшце, усур'ёз узяцца за якасьць уборкі! (БЕЛТА).

С. Мышко

СЬЦЯГ НАД ПАСЁЛКАМ

На нічарбатым ельніку, які клінкам расьсякаў дрыгвиныя балоты, спускаўся вікарослы, каржыкаваты, аблёты малаком-павутой ятловец і павыцыркаўшы чвіньлё, пасушыўшыся з-над ліба, з нясьцерпнай злосьцю пазіраў на рух машыны, якая з кожным перасовам набліжалася, пагражаючы забраць пат рэбяце чалавеку, а нягодная зьнішчыць. Толькі пушыхі ягад—аксамітам пераліваючыся на сонечных праменьвах, гойдаліся ў такт лёкамабілю.

Брыгадзір т. **Шыпуля,** выскачыўшы на броўку і скоса зірнуўшы на пасёлак, які мільгацеў белымі плямамі праз зялёную пляцёнку хвайны і стрэхі, якога быццам гурбы сьнегу таялі сярод зелені. Брыгадзір пазіральна вывучыў, калі сонца пачынае прастрэльваць залацістымі праменьнямі дрэвы, а хвойка, якая стаяла сярод кар'ераў на броўцы, быццам качан капусты, пачне калаціцца, значыць хутка ўзаўецца сьцяг над пасёлкам і зьмена на броўцы.

У яго пэўнуп на працягу сэзону ня поўная брыгада, а сёньня, як на зло, калі да сканчэньня дэкады засталіся два дні, і ўсе дні яны ішлі з перавыкананьнем—два чалавекі ня выйшлі, і калі раптам ня выканаць сёньня—значыць сьцяг астаецца за брыгадай т. **Серабро.** А сьцяг трэба забраць!

Рыўком ускочыў у яму, падперазаў ланцугом корч і крыкнуў машыністу:

— Давай цаверх!

Карчавіна, разьгрочаная навуком, расплаталася на броўцы.

Вызваліўшыся ад карчавіны, якая перашкаджала кар'ернікам у чоткай падачы масы, брыгадзір падскочыў да козьлікаў, якія ўвесь час заядалі:

— **Ды ты-б іх, таварыш...** Падняць трэба і...

Але на поўслове спатканы ўзрок поўстацай, якія набліжаліся ўадоўж кар'ера ад пасёлка да машыны, абарвалі брыгадзіра. Валявыя пачуцьці камандзіра сталі паперадзе—перавыканаць! Ні аднэй мінуты не перадаць зьмене,—спружынёўны трос, закрочыў да кар'еру.

